ПАВЕДАМЛЕННЕ

Цэнтральнай выбарчай камісіі па выбарах у Вярхоўны Савет СССР

У нядзелю, 18 сакавіка 1962 года, праводзіліся выбары ў Вярхоўны Савет СССР шостага склікання. Галасаванне пачалося паўсюды ў 6 гадзін раніцы і закончылася ў 12 гадзін ночы па мясцоваму часу.

Выбары ў Вярхоўны Савет СССР прайшлі ў абстаноўцы вялікага патрыятычнага ўздыму, пры высокай палітычнай актыўнасці насельніцтва, выкліканай гістарычнымі рашэннямі XXII з'езда КПСС.

Для правядзення выбараў у Вярхоўны Савет СССР былі ўтвораны 1.443 выбарчыя акругі, у тым ліку 791 выбарчая акруга па выбарах у Савет Саюза і 652 выбарчыя акругі па выбарах у Савет Нацыянальнасцей. У параўнанні з выбарамі ў Вярхоўны Савет СССР пятага склікання колькасць выбарчых акруг павялічылася на 65, з іх на 53 акругі па выбарах у Савет Саюза і на 12 акруг па выбарах у Савет Нацыянальнасцей.

На падставе папярэдніх даных, якія паступілі ад усіх акруговых выбарчых камісій, Цэнтральная выбарчая камісія ўстанавіла, што ў выбарах прынялі ўдзел 139.947.206 выбаршчыкаў, або 99.95 працэнта выбаршчыкаў, уключаных у спісы.

За кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР галасавала ў выбарчых акругах па выбарах у Савет Саюза 99,43 працэнта і ў выбарчых акругах па выбарах у Савет Нацыянальнасцей 99,14 працэнта выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у выбарах.

Выбары адбыліся ва ўсіх выбарчых акругах.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ САВЕТ СССР.

19 сакавіка 1962 года.



За мір, за шчаслівае жыццё галасуюць пагранічнікі Н-скай заставы — выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі яфрэйтар Габіс Сафіулін (злева), сяржант Уладзімір Бачкароў і яфрэйтар Фёдар Ладзяеў.

У Дзень выбараў у Вярхоўны Савет СССР. Галасуюць праходчык Салігорскага калійнага камбіната Мікалай Пятровіч Шчаглоў (злева), яго жонка Еўдакія Васільеўна і машыніст горнапраходчага камбайна Барыс Пятровіч Жалязінскі.

Слаўся, Айчына ты наша свабодная!

Голас Радзімы

ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАЙ СЕКЦЫІ КАМІТЭТА ЗА ВЯРТАННЕ НА РАДЗІМУ І РАЗВІЦЦЕ КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЕЙ З СУАЙЧЫННІКАМІ

№ 23 (607) | Сакавік 1962 г. | Год выдання 8-ы

У ГОНАР ДНЯ ВЫБАРАЎ

Перамога будаўнікоў

Калектыў будаўнічага ўпраўлення Мінскай цеплацэнтралі № 3, спаборнічаючы ў гонар выбараў у Вярхоўны Савет СССР, дабіўся новых працоўных поспехаў. Датэрмінова закончана бетаніраванне падмуркавай пліты чарговага турбагенератара. Будаўнікі ўклалі больш за 40 тон арматурнай сталі і больш пяцісот кубічных метраў бетону.

Звышпланавая прадукцыя

ОРША. На буйнейшым прадпрыемстве горада — ільнокамбінаце падведзены вынікі спаборніцтва ў гонар выбараў у Вярхоўны Савет СССР. Перадвыбарная вахта прынесла тэкстыльшчыкам новыя поспехі ў барацьбе за датэрміновае завяршэнне дзяржаўных планаў. З пачатку года на іх працоўны рахунак занесена ўжо 140 тон звышпланавай пражы, 155 тысяч метраў гатовай тканіны, 200 тысяч штук мяшкоў, а ўсяго звышпланавай прадукцыі выпушчана на 720 тысяч рублёў.

Падарунак мантажнікаў

ПОЛАЦК. Добры падарунак да Дня выбараў у Вярхоўны Савет СССР падрыхтавалі мантажнікі «Нафтабуда». Яны ўстанавілі самую цяжкую калону атмасферна-вакуумнай трубчаткі першай чаргі нафтаперапрацоўчага завода. Гэта калона была цалкам сабрана на зямлі. Агульная вага яе — 160 тон.

МАТЧЫНА РАДАСЦЬ

Біяграфія мая звычайная, як і многіх жанчын-сялянак былой Заходняй Беларусі. Доўгія гады жыла ў часы гаспадаравання беларускіх акупантаў. Шмат гора і пакут давялося зазнаць і маёй маці. «Пацей, Мацей, калі многа дзяцей», — не раз казала яна.

Не лепш бы склалася і маё жыццё, калі б не Савецкая ўлада. Гэта яна выратавала мяне ад горкай долі, прынесла радасць, адкрыла шырокую дарогу ў жыццё для маіх дзесяці дзяцей, дванаццаці ўнукаў. Не нарадуюся я сваімі дзеткамі. Усе яны ў людзі выйшлі. Дачка Настасся ў мяне — кукурузавод. Вось ужо другі год, як яе звяно паспяхова вырошчвае кукурузу. Летась па 60 цэнтнераў зерня з гектара атрымалі. Не адстае ад дачкі і зяць.

У родным калгасе працуюць сын Павел з жонкай Лідзіяй і дачкой Клеапатрай. А Канстанцін мой машыну водзіць, калгасным шафёрам стаў. Прэміі, падзякі за працу атрымлівае. Іосіф дык той у мантажнікі пайшоў, у РТС працуе цяпер. Максім уладкаваўся на маслазаводзе. Жонка яго — Паліна — лепшая варшчыца кансервавага завода, ударніца камуністычнай працы. На чыгунцы працуе дачка Еўдакія, а Яўгенія — выхавацельніца ў яслях. Глафіра ж — памочнік павара ў міжраённай бальніцы, Уладзімір — нарыхтоўшчык, Зіна — бухгалтар лесагандлёвага склада.

Адным словам, радасна і шчасліва жывуць усе мае дзеці. Ды і сама я жыву ў поўным дастатку, як кажуць, ёсць хлеб і ёсць да хлеба. Нягледзячы на ўзрост, а мне ўжо больш як 80 гадоў, адчуваю сябе добра. Наша краіна па-мацярынску клапоціцца аб людзях. За клопаты аб нас, мнагадзетных маці, за шчасце нашых дзяцей, радаснае, светлае сёння і яшчэ лепшае заўтра, хачу ад душы падзякаваць роднай партыі і ўраду.

М. ЦЕЛІЦА,
маці-гераіня, калгасніца калгаса «Парыжская камуна» Глыбоцкага раёна.

Шырокія навуковыя даследаванні вядзе лабараторыя люмінесцэнцыі і фотахіміі Інстытута фізікі Акадэміі навук БССР. На здымку: у лабараторыі люмінесцэнцыі і фотахіміі. Кандыдат фізіка-матэматычных навук Георгій Паўлавіч Гурыновіч ля аўтамеханічнай устаноўкі для вывучэння люмінесцэнтных уласцівасцей малекул.

ЁН ГАЛАСАВАЎ УПЕРШЫНЮ

Актыўна ішло галасаванне на выбарчым участку ў вёсцы Любішыцы Івацэвіцкага раёна. Вось апускае бюлетэнь калгаснік Міхаіл Гаўрылавіч Выско. Ён упершыню прымае ўдзел у выбарах у савецкі парламент. Звяртаючыся да прысутных, гэты пажылы, з буйнымі маршчынамі на твары чалавек з хваляваннем гаворыць:

— На сваёй Савецкай Радзіме, дзе ўлада належыць працоўнаму народу, мая сям'я знайшла сапраўднае шчасце, аб якім чатыры гады таму назад можна было толькі марыць. Да ўз'яднання Беларусі, у 1938 годзе, я з сям'ёй, як і многія іншыя беззямельныя беднякі, выехаў за акіян. Дваццаць гадоў пражылі далёка ад Радзімы — у Парагваі і Аргенціне. Цяжкая праца знясільвала, падрывала здароўе, а дастатку так і не было. Нашага заграничнага здабытку не хапіла нават на білет, каб вярнуцца на Радзіму. Савецкая краіна прыняла нас, як клапатлівая маці. Мы ўступілі ў калгас. Праўленне выдзеліла нам хлеб, бульбу, дало цялушку. Савецкая дзяржава дапамагла пабудаваць дабротны цагляны дом. Галасуючы за кандыдатаў блоку камуністаў і беспартыйных, мы галасавалі за родную Савецкую ўладу, за мір і камунізм.

Так падказала сумленне

ГОМЕЛЬ. Клопаты партыі аб далейшым развіцці сельскай гаспадаркі, заклік да спецыялістаў і моладзі пайсці на рашаючыя ўчасткі сельскагаспадарчай вытворчасці знайшлі гарачы водгук сярод моладзі Гомельшчыны.

Доўгі час на торфапрадпрыемстве «Беліцкае» Рагачоўскага раёна працаваў трактарыстам камсамолец Фёдар Іваноў. Тут яго прынялі кандыдатам у члены партыі. Механізатар паспяхова спалучаў работу з вучобай у сельскагаспадарчым тэхнікуме. А калі атрымаў дыплом, яго прызначылі майстрам аднаго з участкаў. На новым месцы Іваноў з гонарам апраўдваў званне маладога спецыяліста. Аднак, даведаўшыся пра заклік партыі да моладзі, Фёдар Іваноў выказаў жаданне пайсці працаваць у сельгасарцель «Рассвет» гэтага ж раёна. Калгаснікі цёпла прынялі Фёдара ў сваю сям'ю, а праўленне прызначыла яго механікам трактарна-аўтамабільнага парку.

Малады камуніст Міхаіл Купрэеў працаваў у будаўнічай канторы пры Добрушскім райвыканкоме. Ён таксама папрасіў накіраваць яго на работу ў калгасную вытворчасць. Просьба М. Купрэева задаволена. Ён паехаў на работу ў калгас «Молат» па сваёй спецыяльнасці.

Камсамолка Надзя Кошыцкая скончыла дзесяць класаў, затым тэхнічнае вучылішча і працавала токарам механічнага цэха завода «Гомсельмаш». Яна адгукнулася на заклік партыі і падала ў заводскі камітэт заяву з просьбай паслаць на работу ў калгас. Яе жаданне задаволена.

Васіль Капыткоў, па спецыяльнасці аграном, працаваў сакратаром Добрушскага райкома партыі. Аднак ён даўно адчуваў, што яго месца ў калгасе. І вось ад Капыткова паступіла просьба накіраваць яго ў адзін з калгасаў раёна. На агульным сходзе члены сельгасарцелі імя Калініна абралі В. Капыткова старшынёй праўлення.

Камсамолка Валянціна Макаранка — адна з лепшых швачак-матарыстак Бабруйскай швейнай фабрыкі імя Дзяржынскага. Цэху № 5, у якім яна працуе, нядаўна прысвоена званне калектыву камуністычнай працы. Работу на вытворчасці Валянціна паспяхова сумяшчае з вучобай. Яна — студэнтка 5-га курса завочнага аддзялення Мінскага тэхналагічнага тэхнікума.

ДЗЕНЬ УЧАРАШНІ...

Скарга губернатару

У Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве БССР у Магілёве захоўваецца скарга сялян вёскі Казіміраўка, пададзеная магілёўскаму губернатару.

Вось тэкст гэтай скаргі:

«Мы, ніжэйпадпісаўшыяся, сяляне, былыя прыгонныя генерал-маёра Кранца, пасля скасавання прыгоннага права і ў сучасны момант, абцяжараныя рознымі падаткамі і плацяжом павіннасцей, зусім абяссілелі, не ў стане пракарміць сваіх сем'яў і скаціны. Бог сведка таму, што з аднаго надзела нашай зямлі, г. зн. як ён павінен быць чатыры з палавінай дзесяціны, няма магчымасці пракарміць тры душы сям'і ды аднаго каня...

Мы не можам выплаціць нават чвэрткі нашых павіннасцей, церпім голад, холад і ўсе нястачы. Але ўлады ўжываюць усялякія меры для збору падаткаў... Таму і даводзіцца з палавіны зімы, ды яшчэ і раней, цярпець голад і холад нам і скаціне нашай: у засеках ні зерня, ні ахапка сена ў кутках. А пра вясну і падумаць нават страшна: не толькі каб засталося хоць у малым памеры зерняў хлебных, але нават мякіны. Так што даводзіцца звяртацца да якога-небудзь аканома або арандатара і прасіць мякіны на хлеб ды для каня саломы.

Свайго ў нас нічога няма: ні лесу, ні лугоў, ні прыгоднай дзесяціны поля... Пры вымярэнні нашых палёў каморнікі ад памешчыка за грошы адбіралі ўчасткі ад нашага поля і дабаўлялі да поля памешчыка, між тым, і мы яму плацілі і прасілі змераць наша поле, але гэта было дарэмна, і ён нас ашукаў.

У гэтым годзе жыта зусім выбіта градам так, што засталася адна гнілая салома, і няма ніякай надзеі на выратаванне — мы чакаем галоднай смерці...».

Прашэнне падпісалі 69 сялян. Але бяздушныя царскія сатрапы не сталі яго нават разбіраць.

Магілёўскі губернатар на скарзе напісаў:

«Азначаная скарга пакінута без разгляду, таму што яна падпісана многімі сялянамі, а не асобнымі выбарнымі, прызначанымі мірскім прыгаворам, як патрабуецца 9 пунктам 51 арт. Агульнага палажэння аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннікай залежнасці».

... І СЁННЯШНІ

Вось што расказваюць сягоння жыхары вёскі Казіміраўка— калгаснікі сельгасарцелі ордэна Леніна імя Валадарскага Магілёўскага раёна.

ПОЎНАЯ ЧАША

Заможна жыве наша сям'я. Я працую ў паляводстве, а сястра Анастасія — свінаркай. У мінулым годзе мы ўдзвюх зарабілі 539 рублёў, 80 пудоў зерня і многа іншых прадуктаў. Мы ні ў чым не маем нястачы. Наша жыццё — поўная чаша. Гэта вынік таго, што мы — паўнапраўныя гаспадары свайго жыцця, гаспадары сваёй краіны.

Вера СІВАЕВА,
калгасніца.

ГАНАРУСЯ ЗЕМЛЯКАМІ

Цёмныя, забітыя... У той час іншым і не мог быць лёс селяніна-беларуса. Як добра, што ўсё гэта канула ў незваротнае мінулае.

Перабіраючы ў памяці ўсіх жыхароў вёскі, я нават не адважваюся назваць агульную колькасць нашых землякоў, якія скончылі за гады Савецкай улады вышэйшыя або сярэднія навучальныя ўстановы. Нашы аднавяскоўцы сталі педагогамі, інжынерамі, урачамі і г. д. Да прыкладу, сам я скончыў Магілёўскае педагагічнае вучылішча і цяпер працую ў роднай вёсцы настаўнікам.

Першым вучоным чалавекам у Казіміраўцы быў Васілій Аўсеенка. У 1922 годзе ён стаў каморнікам. А цяпер? Яго брат Міхаіл — палкоўнік. Сцяпан Ермаленка скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут. Яго брат Мікалай — студэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна. Кажамякіна працуе урачом, будаўніком — Аляксандр Сіваеў. Вера Краўчанка — загадчык навучальнай часткі ў адной са школ Чавускага раёна, а Уладзімір Аўсеенка — лётчык грамадзянскага паветранага флоту. І так амаль у кожнай сям'і.

Пётр ЧУПРЫНСКІ,
настаўнік Казіміраўскай школы.

ЭЛЕКТРЫЧНЫЯ ПАМОЧНІКІ

Электрычнасць трывала ўвайшла ў побыт хлебаробаў. Як толькі наступае вечар, у кожным доме запальваюцца лямпачкі Ільіча. Электраэнергія жывіць радыёпрыёмнікі, тэлевізары.

А ўзяць гаспадарчыя работы. Зараз у нас працуе 78 электрамацораў. Яны прыводзяць у рух 2 млыны і 2 піларамы, станкі калгаснай майстэрні, дапамагаюць кавалям, выкарыстоўваюцца ў водазабеспячэнні і прыгатаванні кармоў для грамадскага статку. На трох фермах устаноўлены і працуюць электрадаільныя апараты.

У нас зараз няма такога віду работ, дзе б не знайшла свайго прымянення электраэнергія.

Васілій ШУЦІЛАЎ,
старшы электраманцёр.

Культура ў кожным доме

Раней нашу Казіміраўку нельга было нават назваць вёскай. Усяго некалькі струхлелых хацінак тулілася. А зараз на вуліцах моцныя, дабротныя дамы выстраіліся. У маладым сасновым гаі размясціўся жывёлагадоўчы гарадок. Далей —брыгадны двор, клуб і кантора праўлення арцелі. Ёсць у вёсцы магазін, сталовая, паштовае аддзяленне, млын, раённае аддзяленне «Сельгастэхнікі».

Разам з ростам вёскі далёка ўперад рушыла і культура яе жыхароў. У многіх дамах — радыёпрыёмнікі, ва ўсіх дамах — рэпрадуктары, а ў некаторых ёсць і тэлевізары. Калгасны клуб—улюбёнае месца адпачынку аднавяскоўцаў.

Як бачыце, жыццё людзей змянілася. Для іх будучае—гэта далейшы рост дабрабыту, рост культуры, поўнае задавальненне ўзрастаючых патрэб. Усё гэта вынікі Савецкай улады і калгаснага ладу.

Аляксандр ЯКІМЕНКА,
галоўны бухгалтар сельгасарцелі.

ЗА МІР, ПРАЦУ, ШЧАСЦЕ



Мікалай Антонавіч Насеннік з сынамі Барысам і Георгіем.

В ЯЛІКІМ святам быў дзень 18 сакавіка ў нашай краіне. Савецкія людзі дружна ішлі на выбарчыя ўчасткі, каб выканаць свой пачэсны абавязак — прыняць удзел у выбарах у Вярхоўны Савет СССР.

Разам з усімі грамадзянамі краіны Саветаў за мір, працу, шчасце аддаў свой голас і былы рабочы Мінскага мотавелазавода Мікалай Антонавіч Насеннік. Ён галасаваў за Савецкую ўладу, якую абараняў яшчэ 44 гады таму назад.

18-гадовым юнаком пайшоў Мікалай Насеннік у Чырвоную гвардыю. Абараняў родную Беларусь ад белапалякаў, удзельнічаў у баях пад Баранавічамі, Пінскам. Пад Роўна цяжка захварэў на тыфус, хворы трапіў у палон.

Потым лагер у Лодзі, адтуль завербаваўся на работу ў Францыю, чатыры месяцы працаваў на шахтах. Затым падаўся ў Англію, год працаваў у Германіі. У 1923 годзе зноў апынуўся ў Польшчы, тут ажаніўся з беларускай дзяўчынай Вольгай. Нарадзіўся сын Барыс. Але жыць у панскай Польшчы не было з чаго. Прыйшлося Насенніку наняцца на палявыя работы ў Францыю, потым працаваў на шахтах і, нарэшце, прыпыніўся на золатапрамысловым заводзе ў невялічкім гарадку Караксон, непадалёку ад іспанскай граніцы. На заводзе працаваў 16 год. Набыў спецыяльнасць, стаў нядрэнна зарабляць. Але ўвесь час думаў аб вяртанні на Радзіму. Ужо аформіў неабходныя дакументы, аднак перашкодзіла вайна.

Цяжка прышлося Насенніку і яго сям'і, калі гітлераўскія войскі акупіравалі Францыю. Мікалая Антонавіча адправілі ў лагер. Як неабходнага спецыяліста яго хутка выпусцілі, аднак адыходзіць з тэрыторыі завода ён не меў права. Рызыкуючы жыццём, Мікалай Антонавіч прымаў удзел у Супраціўленні, быў звязаны з макі — французскімі партызанамі, даставаў для іх дынаміт.

Пасля сканчэння вайны Насеннік быў старшынёю Поўдня Францыі па адпраўцы на Радзіму. Некалькі соцень сем'яў савецкіх людзей з яго дапамогай вярнуліся дадому, а ў 1947 годзе вярнуўся ў родны Мінск і сам Мікалай Антонавіч, разам з ім прыехалі яго жонка Вольга Мікалаеўна і два сыны — Барыс і Георгій.

Бацька і сыны пачалі працаваць на Мінскім мотавелазаводзе. Бацька—старшым майстрам пара-сілавога цэха, сыны—токарамі. Нялёгка ў той час жылося ў зруйнаваным Мінску, цяжка было з жыллём. Але савецкія людзі чула аднесліся да Насеннікаў. Спачатку іх размясцілі ў бараку, хутка перабраліся ў невялікую кватэру. А чатыры гады назад сям'я атрымала новую вялікую кватэру з усімі зручнасцямі.

На мотавелазаводзе Мікалай Антонавіч працаваў да 1958 года, ужо чацвёрты год ён на пенсіі, але да гэтага часу не забывае завода, лічыць яго сваім.

— Наш завод і параўноўваць нельга з заводам у Караксоне, — гаворыць ён. Іншыя ўмовы працы, штогадовы месячны адпачынак. А такога выдатнага абсталявання ў Францыі мне і бачыць не прыходзілася.

М. А. Насенніку залічылі гады работы ў Францыі, завод з пашанай праводзіў яго на пенсію. Штомесяц ён атрымлівае 85 рублёў. Разам з ім жыве старэйшы сын Барыс з жонкай Зояй і сынам Жорам. Зоя — інжынер, працуе на мотавелазаводзе. Малодшы Георгій таксама ажаніўся, атрымаў кватэру.

Абодва браты працуюць у інструментальным цэху. Барыс — токар шостага разраду, яго імя занесена на Дошку гонару, не адстае ад яго і Георгій.

Часам атрымлівае Мікалай Антонавіч пісьмы з Францыі, старыя сябры пішуць, што завод у Караксоне закрылі, а рабочых выкінулі на вуліцу. Маладыя яшчэ могуць знайсці працу, а старым няма на што спадзявацца.

— Страшна падумаць, што чакала мяне, калі б я застаўся ў Францыі,—гаворыць М. А. Насеннік.—А цяпер я спакойны за заўтрашні дзень, спакойны за лёс сваіх дзяцей.

Т. РЭУТОВІЧ.

Барыс і Зоя Насеннікі часта праводзяць свой адпачынак на поўдні краіны. Яны пабывалі ў Цхалтуба, Алушце, Еўпаторыі. У Еўпаторыі разам з імі адпачываў і маленькі Жора.

Механічныя мускулы хлебаробаў

На змену ручной працы прышла магутная тэхніка. Палі сельгасарцелі апрацоўваюць 14 трактараў. Даўно закінуты серп і саха — спрадвечныя спадарожнікі рабскай працы. Серп замяняюць 7 збожжавых камбайнаў. Пасадка бульбы і сяўба кукурузы вядуцца толькі машынамі. Убіраюцца гэтыя культуры 5 спецыяльнымі камбайнамі. Аўтапарк калгаса налічвае 20 аўтамашын.

Безумоўна, для нашай гаспадаркі гэтай тэхнікі яшчэ недастаткова. Нам патрэбны машыны па механізаванаму ўнясенню мясцовых угнаенняў у глебу і многія іншыя. У бліжэйшы час мы іх будзем мець. Аб гэтым паклапаціўся Сакавіцкі пленум ЦК КПСС.

Фёдар ПАНЧАНКА,
учотчык трактарнай брыгады.

Калгаснае дзякуй

18 сакавіка працоўныя нашай краіны выбралі свой савецкі парламент. Напярэдадні гэтага дня Камуністычная партыя ў Звароце да ўсіх выбаршчыкаў зрабіла справаздачу аб рабоце за перыяд з дня мінулых выбараў. Вынікі цудоўныя! І гэтыя поспехі мы бачым на кожным кроку, у кожнай галіне народнай гаспадаркі.

Наша сельскагаспадарчая арцель невялікая. Мы маем каля адной тысячы гектараў ворнай зямлі. Але як і ва ўсіх калгасах Лепельскага раёна, за мінулыя чатыры гады намнога палепшыліся ўмовы нашага жыцця і працы. Укараненне ў вытворчасць дасягненняў навукі і перадавога вопыту дазволіла нам павысіць урадлівасць палёў.

Машыны прышлі на дапамогу хлебаробам. Каля 90 працэнтаў усіх работ у паляводстве механізаваны. Шэсць трактараў замянілі конныя плугі, закінуты і серп. Цяжкая праца жней заменена працай камбайнаў. Маем бульбаўборачны і сіласаўборачны камбайны, ільноцерабілкі.

Паспяхова развіваецца грамадская жывёлагадоўля, растуць грашовыя даходы арцелі. За апошнія тры гады гаспадарка выйшла ў лік мільянераў. У 1961 годзе ў калгасную касу паступіла 128 644 рублі. Толькі за мінулыя чатыры гады пабудавалі 12 жывёлагадоўчых і іншых гаспадарчых памяшканняў. Зараз узводзіцца тыпавы кароўнік на 200 галоў.

Усе жывёлагадоўчыя памяшканні механізаваны. У кароўніках абсталяваны аўтапаілкі, на ўсіх фермах пабудаваны падвясныя дарогі, гарыць электрычнае святло ад калгаснай электрастанцыі.

Дастатак прыйшоў у калгасныя сем'і. Прайдзіце па нашых вёсках, зазірніце ў дамы калгаснікаў, і вы ўбачыце ў іх дабротную мэблю, музычныя інструменты, шмат кніг.

Калгас наш аб'ядноўвае чатыры вёскі. Усе яны радыёфікаваны і электрыфікаваны. Летась на кожны працадзень мы атрымалі па 63 капейкі грашыма, па аднаму кілаграму зерня.

Аб росце даходаў калгаснікаў сведчаць і такія факты, як набыццё каштоўных рэчаў і будаўніцтва ўласных дамоў. За мінулы год наваселле справілі Качан Сямён Ігнатавіч, Стрэльчанка Фёдар Іванавіч, Ляйко Еўдакія Іванаўна, Палонская Раіса Іванаўна і іншыя. Усяго 12 калгаснікаў. І так штогод. Краснік Мікалай Ягоравіч купіў матацыкл, калгаснікі Тэшка Іван Пятровіч, Зэлькін Альфрэд Якаўлевіч, Палонскі Фрыдрых Фёдаравіч, Шпак Мікалай Архіпавіч і іншыя купілі радыёпрыёмнікі.

Усе нашы дзеці вучацца бясплатна ў школе. Пасля работы калгаснікі ідуць у свой клуб. Тут можна пачытаць свежую газету і часопіс, згуляць у шашкі або даміно, паслухаць лекцыю, паглядзець кіно.

За ўсё, што створана для нашага заможнага і культурнага жыцця, мы ўдзячны партыі, Савецкай уладзе. Таму 18 сакавіка мы аддалі свае галасы за пасланцоў у савецкі парламент. А нашы кандыдаты — верныя сыны і дочкі партыі і народа. Мы галасавалі за свінарку калгаса «Шлях да камунізма» Расонскага раёна Яўгенію Дзмітраўну Куксёнак (у Савет Нацыянальнасцей) і за камандуючага войскамі БВА Валянціна Антонавіча Пянькоўскага (у Савет Саюза).

Калгаснае дзякуй роднай партыі і Савецкаму ўраду за клопаты аб нас, простых савецкіх працаўніках.

А. КУЛАКОЎ,
бухгалтар калгаса імя Тэльмана Лепельскага раёна.

Малая, але цікавая

Дзякуй, што прысылаеце мне вашу газету. Я яе люблю чытаць. Хоць яна малая, але цікавая. Многа чаго ў ёй ёсць.

Я б хацеў вас прасіць, каб вы выслалі мне таксама газету на рускай мове, таму што мне па-беларуску цяжка чытаць. Я вучыўся ў царскай Расіі.

Яшчэ раз дзякую.

І. ЕСАЕНЯ.

ЗША.

Усё, што намячае КПСС, будзе выканана

Вашу паштоўку з віншаваннем да Новага года і кнігі атрымаў, за што вам вельмі ўдзячны. Я прачытаў кнігі. Яны цудоўныя. Калі чытаеш савецкую кнігу, то бачыш, якая розніца паміж нашай літаратурай і заходняй. У заходняй літаратуры пішуць пра банды, забойствы, грабяжы, аб тым, як жывуць багатыя. А рабочаму чалавеку няма месца ў заходняй літаратуры.

Тут, у заходнім «раі», капіталісты памнажаюць свае прыбыткі за кошт эксплуатацыі рабочага, выціскаюць з яго апошнія кроплі поту, а пасля таго, калі яго здароўе зусім пагоршыцца, выкідваюць на вуліцу, і яму даводзіцца паміраць у халоднай кватэры або пад плотам. Некаторыя ўхітраюцца рабіць так: пачынаюць жабрачыць, а за тое, што стары чалавек папросіць кавалак хлеба, па нямецкіх законах яго асудзяць на тры месяцы турмы. Вось ён і правядзе зіму ў цяпле, забяспечаны жыллём і ежай.

Рабочы чалавек тут у даўгах па самую шыю. І калі плаціць няма чым, ён канчае жыццё самагубствам або яго за няўплату даўгоў саджаюць у турму, а маёмасць суд канфіскуе. Некалькі слоў хачу сказаць аб некаторых нашых эмігрантах, якія расхвальваюць заходнюю дэмакратыю і ствараюць тут усякія камітэты. Гэта брудныя людзі, якія здрадзілі сумленню і Радзіме. Яны ў сваім жыцці не ведалі ні фізічнай, ні разумовай працы, яны толькі навучыліся гандляваць сваім сумленнем.

Але іх паклёпы не могуць перашкодзіць таму, што намеціў XXII з'езд Кампартыі. Яны ўзнялі гвалт у заходняй прэсе, што, маўляў, такая праграма неажыццявіма. Але наш Савецкі ўрад ужо не раз паказваў заходнім паклёпнікам, што ўсё тое, што намячае Кампартыя, ажыццявіма.

Нядаўна быў брат амерыканскага прэзідэнта ў Заходнім Берліне. Ён сказаў, што ЗША будуць дапамагаць Заходняй Германіі і яшчэ больш перакінуць амерыканскіх фірм у Заходні Берлін. Гэта ўсё трэба для таго, каб амерыканцы яшчэ больш авалодалі Заходняй Германіяй.

На гэтым я заканчваю сваё пісьмо.

З прывітаннем

ФРГ. *В. В.*

НЕ САЛОДКАЕ НАША ЖЫЦЦЁ

Шматпаважаныя сябры! Вельмі ўдзячны за тое, што вы задаволілі маю просьбу. Я атрымаў ужо два нумары газеты «Голас Радзімы», якія я вельмі ахвотна прагледзеў, а некаторыя месцы нават па некалькі разоў перачытаў.

Аб жыцці нашым у Канадзе адно толькі магу сказаць, што не з кожным годам, а нават з кожнай чвэрткай года жыццё становіцца ўсё горшым і горшым. Раскажу аб сабе. Я кравец жаночых паліто сярэдняй цаны. У магазіне такое паліто прадаецца за 159 долараў, а работнік атрымлівае за пашыў гэтага паліто 2 долары, увесь матэрыял на паліто каштуе да 40 долараў. Па гэтаму маленькаму прыкладу можна меркаваць аб жыцці рабочага, а таксама прадаўца, які павінен перад упрайляючым хадзіць на дыбачках, каб яго не зволілі з работы.

Тут італьянцы ходзяць з адной фабрыкі на другую і прапануюць працаваць два тыдні без аплаты, а потым атрымліваць столькі, колькі захоча гаспадар, а не колькі яны будуць зарабляць. Так і праходзіць жыццё ў капіталістычнай краіне.

Прабачце за маё скромнае пісьмо, я вельмі ўдзячны за газету. Як будзе магчымасць наведаць Радзіму, пастараюся зайсці і ў рэдакцыю.

З павагай *М.*

Канада.

Змагары ад здрады

Англія, А. Г. Вайтовічу

Дарагі зямляк! Вы пішаце, што ў радзе пана Астроўскага цяпер засталіся толькі самыя заядлыя ворагі Савецкага ладу. Не трэба здзіўляцца. Радаслаў, ці, як у нас яго празвалі, Здраслаў Астроўскі ў час Вялікай Айчыннай вайны паказаў сябе лютым зверам і катам беларускага народа. Усё чалавецтва асуджала гітлераўцаў і са зброяй у руках змагалася супраць іх, а пан Астроўскі бессаромна ўслаўляў акупантаў, дапамагаў ім разбураць нашы гарады і вёскі, пагражаў смерцю кожнаму, хто заступаў гэтай нечысці дарогу.

Крывавы след пакінулі на нашай зямлі гітлераўскія каты Кубэ, фон Готберг, Хойзінгер. Спадар Астроўскі лічыў іх «самымі лепшымі» сябрамі беларускага народа і задаволена паціраў рукі, калі гэтыя «сябры» патрабавалі ад сваіх падначаленых дзейнічаць у Беларусі «нечакана і бязлітасна», «бясшумна прыбіраць з дарогі непатрэбных сведак», «знішчаць кожнага, хто трапіць у засаду», затым стварылі непадалёк ад Баранавіч Калдычоўскі лагер смерці, у якім тысячамі знішчаліся лепшыя сыны нашай Радзімы. Уся абслуга ў гэтым лагеры рэкрутавалася з гадунцоў гэтак званай БЦР, якую вось ужо гадоў дваццаць запар узначальвае Астроўскі.

Нацыяналістычныя карнікі, прадаўшыся фашыстам, насілі нямецкую ваенную форму з пагонамі і пятліцамі. На шапках у іх была эмблема — выціснуты з бляхі чэрап і скрыжаваныя косці. Верхаводы БЦР разумелі, што такая фашысцкая аздоба вельмі адкрыта выказвае сутнасць «войск самааховы». Астроўскі асабіста прасіў сваіх гаспадароў замяніць гэту эмблему больш «мяккім сімвалам»: нацыяналістычнай «пагоняй». Але яны адхілілі гэту просьбу свайго «незалежнага саюзніка», далі яму зазумець, што самаахова была створана для барацьбы з беларускімі партызанамі і Савецкай Арміяй.

Далёка ўсё гэта. Цяпер, ператасаваўшы свае бітыя казыры, Астроўскі падлізваецца да амерыканскіх імперыялістаў. А на бязрыб'і, як кажуць, і рак рыба. Падпальшчыкі новай вайны ўзялі на сваё ўтрыманне гэтага гора-вызвольніка і яго ненажэрлівую хеўру. Перад БЦР пастаўлена задача: больш актыўна выкарыстоўваць былых гітлераўскіх паслугачоў у барацьбе супраць Савецкага Саюза і краін народнай дэмакратыі.

Не спускаюць вачэй з бэцэраўскіх недабіткаў і ў Боне. Прадажная рада Астроўскага ўжо зараз пастаўляе гарматнае мяса для бундэсвера. Спадар «прэзідэнт» асабіста адправіў на службу ў Бон свайго дружка Сянько. Рыхтуюцца перабрацца туды былыя карнікі Суравы, Серафімовіч, Варава і ўся іншая нечысць, якой ужо няма іншага выбару, як толькі дагаджаць чужынцам.

Адным словам, сябры гэтак званай БЦР з лёгкасцю кабарэтных патаскушак мяняюць сваіх гаспадароў. Спаборнічаць з імі ў ачмурэлай бегатні ад карыта да карыта могуць толькі недабітыя «вызвольнікі» з абрамчыкавай БНР. Мяркуючы па «зацемках» у мюнхенскім нацыяналістычным лістку, гэтае зборышча здраднікаў перажывае «самыя драматычныя дні». За апошнія колькі год БНР некалькі разоў мяняла арыентацыю і цяпер ніяк не можа звесці канцы з канцамі, каб хоць з большага апраўдаць свае антынародныя пазіцыі.

Да чаго ж усе гэтыя паны імкнуцца?

Савецкі лад ліквідаваў эксплуатацыю чалавека чалавекам. Вызваленая ад панскага прыгнёту Беларусь ператварылася ў магутную суверэнную дзяржаву. Падкапацца пад яе асновы, расхістаць светлы будынак сацыялізма немагчыма. Таму змагары ліхаманкава шукаюць падтрымкі ў нямецкіх рэваншыстаў. Ініцыятары гэтай «патрыятычнай акцыі» меркавалі, відаць, хутка ўладкавацца на цёпленькія пасады ў бундэсверы. Але падзеі разгортваюцца ў іншым напрамку. Сваімі шашнямі з падпальшчыкамі новай вайны БНР, як і БЦР, канчаткова скампраметавала сябе. Цяпер ужо ніхто не верыць у «святы патрыятызм» паноў абрамчыкаў, астроўскіх, станкевічаў, кушаляў, рагуляў і ім падобных. БЦР ужо сыйшла са сцэны, прыціхла, а «парыжскі блёк» нагадвае асінае гняздо. Пацярпеўшы поўнае фіяска на палітычнай арэне, Абрамчык раптам занямог і злёг у пасцель. Потым змагары зноў паднялі яго на ногі і цяпер рыхтуюць у «ваяж» па краінах Еўропы і Амерыкі, каб неяк паправіць становішча, наскрэбсці сякі-такі капітал на антысавецкую дзейнасць.

Гэтай здрадніцкай мэце падпарадкаваны і друкаваныя органы нацыяналістаў. Канчаткова парваўшы з Радзімай, мюнхенскія адшчапенцы гатовы на любую правакацыю, абы толькі выслужыцца перад сваімі хлебадаўцамі. Для іх не было і няма нічога светлага, усё, чаго мы дамагліся за гады Савецкай улады, яны чэрняць, аблліваюць брудам.

«У Савецкім Саюзе нічога няма, — пішуць яны. — Рабочыя там галадаюць, сяляне кідаюць свае гаспадаркі і ўцякаюць з калгасаў». Няхай паны-нацыяналісты цешаць сябе гэтымі бязглуздымі выдумкамі. Але праўду не заслоніш хлуснёй, як нельга ў светлы вясновы дзень засланіць сонца. Гэта ж факт, што ў 1953 годзе наша дзяржава прадала насельніцтву 1 мільён 757 тысяч тон мяса і іншых прадуктаў, а летась — 4 мільёны 33 тысячы тон. Давайце параўнаем: было 1,7 мільёна — стала 4 мільёны тон. Вось так «згортваецца вытворчасць сельскагаспадарчых прадуктаў». Гэта ж факт, што ў 1953 годзе наша дзяржава прадала насельніцтву 1 мільён 980 тысяч тон малака, а ў мінулым годзе — 9 мільёнаў 393 тысячы тон. Было 1,9 мільёна тон — стала 9,3 мільёна тон. Вось дык прыкмета «голаду»!

У непрыгляднае становішча тупалобых пустабрэхаў трапілі мюнхенскія гора-эканамісты, злосна шальмуючы і ўтойваючы ад сваіх чытачоў тэмпы жыллёвага і культурнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе.

Камуністычная партыя нашай краіны як раней, так і цяпер настойліва і паслядоўна вядзе справу да таго, каб усе працоўныя жылі ў дастатку. Ужо цяпер мы пераўзыходзім усе найбольш развітыя капіталістычныя краіны, у тым ліку Злучаныя Штаты Амерыкі, па такіх важнейшых паказчыках, як забяспечанасць працай, скарачэнне рабочага дня, медыцынскае абслугоўванне, сацыяльнае забеспячэнне, жыллёвае будаўніцтва. Дастаткова сказаць, што толькі за апошнія пяць год новыя кватэры атрымалі 50 мільёнаў савецкіх людзей. Кожны год у нас будуецца кватэр у разліку на тысячу чалавек насельніцтва ў два разы больш, чым у Злучаных Штатах Амерыкі і Францыі, у два з лішнім разы больш, чым у Англіі і Італіі. За час, прайшоўшы з мінулых выбараў у Вярхоўны Савет СССР, гэта значыць за чатыры гады, у гарадах і рабочых пасёлках пабудавана больш 314 мільёнаў квадратных метраў жылля. Калі мець на ўвазе, што ўвесь дарэвалюцыйны жыллёвы фонд у гарадах і пасёлках Расіі складаў 180 мільёнаў квадратных метраў, дык гэта значыць, што толькі за чатыры гады савецкія людзі пабудавалі амаль у два разы больш таго, што было зроблена на працягу стагоддзяў.

У пачатку сакавіка гэтага года ў Маскве адбыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта нашай партыі. Гэта быў першы пасля XXII з'езда КПСС Пленум ЦК, на якім усебакова абмяркоўваліся важнейшыя задачы камуністычнага будаўніцтва, ператварэння ў жыццё новай Праграмы партыі. На парадку дня стаяла пытанне аб мерах далейшага развіцця сельскай гаспадаркі і стварэння ў краіне багацця збожжа, мяса, малака і іншых прадуктаў, неабходных для поўнага забеспячэння растучых патрэб народа. Вырашаючы гэту задачу, працоўныя краіны сацыялізма, у тым ліку і беларусы, дамогуцца яшчэ лепшых поспехаў. Мы не скідаем шапкі перад капіталістамі, а самі забяспечваем сябе ўсім неабходным. А панам-нацыяналістам гэта як даўбешкай па галаве. Самі яны нават пальцам аб палец не стукнулі, каб хоць штонебудзь пабудаваць на зямлі. Усе іх дэмагагічныя разважанні аб патрыятызме прасякнуты лютай нянавісцю да працоўных Беларусі. Панам астроўскім, абрамчыкам, кушалям не падабаецца, што народ пазбавіў іх магчымасці рабаваць, нажываць сабе маёнткі на людскім поце і крыві.

Мюнхенскія «вызвольнікі» намагаюцца закінуць агонь братазабойчай вайны ў нашу краіну. Уся іх пісаніна разлічана на распальванне нянавісці паміж людзьмі. Толькі аб сваіх разнагалоссях яны маўчаць, як вады ў рот набраўшы. Галоўнае, думаюць яны, каб людзі не здагадваліся, што ў абрамчыкавай багадзельні ўсё падначалена лёгкай нажыве.

Але шыла ў мяшку не схаваеш. Той, каму дарагія інтарэсы нашага народа, не пойдзе па розум да гэтых адшчапенцаў. Гісторыя, савецкія людзі даўно вынеслі свой строгі прысуд крывасмокам Абрамчыку, Астроўскаму, Кушалю, Станкевічу і іх падгалоскам. Ім ніколі не было і не будзе спагады! Аб гэтым нядаўна зноў на ўвесь голас загаварылі былыя вязні Калдычоўскага лагера смерці, якія цудам засталіся жывымі і цяпер патрабуюць выдачы Савецкаму Саюзу гэтых катаў і суда над імі.

Вы маеце рацыю, дарагі зямляк, што канчаткова парвалі з нацыяналістычным кодлам. Дзе б вы ні былі, што б ні рабілі, заўсёды памятайце аб сваёй Радзіме, аб сваіх родных і блізкіх, якія, напэўна, чакаюць не дачакаюцца вас дадому. Прыязджайце да нас у госці, самі пераканаецеся, як хораша і дружна мы цяпер жывём, што будуем і аб чым марым.

З пашанай

А. БУДЗЕЙКА.

Маладзее родны горад

Даўно мінулі цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны. Не пазнаць цяпер горада Веткі, што на Гомельшчыне. Ён змяніў сваё аблічча, памаладзеў. На тых месцах, дзе былі адны руіны, выраслі новыя жылыя дамы, адміністрацыйныя, гандлёвыя і культурна-асветныя пабудовы. За кароткі тэрмін былі нанова адбудаваны карпусы ткацкай і прадзільнай фабрык, уведзены ў строй цэхі райпрамкамбіната, харчкамбіната, камбіната бытавога абслугоўвання. У сучасны момант горад мае развітую прамысловасць. Прадукцыя ветканчан добра вядома не толькі ў гарадах і населеных пунктах вобласці, а і за межамі рэспублікі.

За пасляваенны перыяд шырокі размах набыло жыллёвае будаўніцтва, асабліва індывідуальнае. Толькі за апошнія гады рабочыя і служачыя раённага цэнтра пабудавалі каля тысячы дамоў. Дзяржава аказвае вялікую дапамогу забудоўшчыкам, адпускае ім доўгатэрміновыя пазыкі, выдзяляе будаўнічы матэрыял, дапамагае з транспартам.

Ветка стала культурным горадам. Тут ёсць 3 клубы, 6 бібліятэк, агульны фонд якіх перавышае 40 500 экземпляраў кніг, ёсць 2 сярэднія школы, працуюць дзіцячыя яслі і сад.

На прамысловых прадпрыемствах Веткі шырыцца спаборніцтва за званне брыгад камуністычнай працы. Некаторыя змены прадпрыемстваў ужо ўдастоены гэтага ганаровага звання. На ткацкай, прадзільнай фабрыках, камбінаце бытавога абслугоўвання працуе многа ўдарнікаў камуністычнай працы. Так, прадзільшчыца ўдарнік камуністычнай працы з прадзільнай фабрыкі Рэма Латушкіна працуе ўжо ў лік пятага года сямігодкі. Такіх прыкладаў можна прывесці многа.

Камсамольска-маладзёжная брыгада слесараў-інструментальшчыкаў, якой кіруе Віктар Пінчук,—перадавая на Гомельскім падшыпнікавым заводзе. Яна носіць званне калектыву камуністычнай працы. На здымку: В. Пінчук у тэхнічнай бібліятэцы завода.

ЗАЎСЁДЫ З ВЯЛІКІМ ПОСПЕХАМ



Багушэўскі народны тэатр заканчвае работу над камедыяй А. Макаёнка «Лявоніха на арбіце». Ідуць апошнія падрыхтаванні да прэм'еры. Колькі клопатаў і хваляванняў звязана з імі ў рэжысёра, мастака і акцёраў.

— І заўсёды так,— гаворыць рэжысёр тэатра Раіса Барысаўна Сарочкіна. — Кожная прэм'ера вялікае выпрабаванне для калектыву, своеасаблівы экзамен для яго ўдзельнікаў. Хочацца, каб усё ў спектаклі стала на сваё месца і набыло ясныя закончаныя формы. Кожны з нас імкнецца правільна данесці да гледача думку аўтара, стварыць запамінальны вобраз.

Раіса Барысаўна — сапраўдны энтузіяст самадзейнага мастацтва. З 1929 года ўдзельнічае яна ў клубнай самадзейнасці Багушэўска. А калі ў пачатку 1959 года драматычнаму калектыву Дома культуры было прысвоена званне Народнага тэатра, Раіса Барысаўна стала яго рэжысёрам. Вялікую дапамогу аказваюць тэатру народны артыст БССР Ц. М. Сяргейчык і старэйшая артыстка тэатра імя Я. Коласа А. П. Радзялоўская.

За няпоўныя тры гады калектыў тэатра паставіў больш дзесяці п'ес. Сярод іх «Дзівосы на калёсах» П. Данілава, «Чалавек вярнуўся» П. Васілеўскага, «Не верце цішыні» І. Шамякіна. З вялікім поспехам прайшлі выступленні тэатра не толькі ў калгасах і саўгасах раёна, але і за яго межамі—у Бешанковічах, Оршы, Талачыне, Лёзне, Гарадку і ў іншых райцэнтрах вобласці.

І вось апошнія рэпетыцыі «Лявоніхі».

Са сцэны даносяцца прыглушаныя галасы акцёраў, якія паўтараюць найбольш важныя маналогі.

— Паўторым першы акт поўнасцю, — гаворыць Раіса Барысаўна Сарочкіна.

Вельмі хвалюецца рабочы саўгаса «Багушэўскі» Вадзім Краеў. Хоць яго роля і невялікая, але ж трэба ўлічыць: чалавек упершыню будзе выступаць са сцэны Народнага тэатра. Больш упэўнена адчуваюць сябе ветэраны — выхавацельніца дзіцячага сада Марыя Грыцкевіч, настаўнік Міхаіл Бондысеў, фельчар Віктар Лаўчыноўскі.

Паралельна з работай над камедыяй А. Макаёнка «Лявоніха на арбіце» калектыў тэатра працуе над п'есай А. Успенскага «Дзяўчына з вяснушкамі».

Ул. СКАПА.



Вясеннія воды. Фота П. Нікіціна.

Новае жыццё прышло ў вёску Малатковічы Пніскага раёна — у былую палескую глуш. На здымках (зверху ўніз): 1. Сельская бальніца. 2. У радзільным аддзяленні бальніцы. 3. Выхаванцы Малатковіцкага дзіцячага сада летам на прагулцы.

ВЫБАРЧАЕ ПРАВА ПА-АМЕРЫКАНСКУ

Нядаўна ў штаце Місісіпі, паблізу горада, які па іроніі лёсу атрымаў назву Ліберці (г. зн. Свабода), быў выяўлены труп негра Герберта Лі. Яго забілі за тое, што ён хацеў зарэгістравацца ў спісах выбаршчыкаў на выбарах у мясцовыя органы ўлады. Журы, у састаў якога ўваходзілі толькі белыя, кваліфікавала забойства Лі як «забойства пры апраўданых акалічнасцях». Харст—расіст, які забіў Герберта Лі,—быў апраўданы. Ён вярнуўся на сваё месца ў заканадаўчым сходзе штата Місісіпі, дзе ён з'яўляецца членам ніжняй палаты.

Так у Амерыцы афіцыяльна апраўдваюць забойства негра, які пажадаў прыняць удзел у выбарах.

Аднак расісты не задавальняюцца адкрытым тэрорам і запалохваннем. У цяперашні час яны пачалі шырокую кампанію з мэтай змяніць і без таго дыскрымінацыйныя законы, якія датычаць выбарчых правоў неграў. Так, у штаце Алабама збіраюцца стварыць спецыяльнае ўпраўленне, якое валодала б выключным правам вырашаць пытанне аб тым, хто мае права выбіраць і быць выбраным; толькі гэта ўпраўленне будзе займацца складаннем анкет для праверкі пісьменнасці, якія павінны запаўняць усе негры. Новае ўпраўленне само будзе ўстанаўляць аб'ём патрабуемых ведаў. Анкеты будуць час ад часу мяняцца і ўручацца кожнаму, хто пажадае зарэгістравацца ў якасці выбаршчыка, у запячатаным канверце.

Не лепшае становішча і ў штаце Луізіяна. Нядаўна прадстаўнікі камісіі па грамадзянскіх правах наведалі Новы Арлеан для расследавання скаргаў наконт дыскрымінацыі неграў-выбаршчыкаў. У прыватнасці, камісія зацікавілася акругай Плакмінс, у якой з 4.136 дарослых неграў зарэгістравана ў якасці выбаршчыкаў толькі 47 чалавек. Чыноўнік, які рэгіструе выбаршчыкаў, у даным выпадку пані Мэры Этэль Фокс, заявіла, што яна не дапускае ніякай дыскрымінацыі. Яна, маўляў, толькі прапануе неграм адказаць на пытанні спецыяльнай анкеты. Калі негр спраўляецца з пытаннямі, то яго ўносяць у выбарчыя спісы.

Выслухаўшы тлумачэнне пані Фокс, члены камісіі ўручылі ёй тую ж анкету, якую яна прапануе неграм, і папрасілі адказаць на пастаўленыя ў ёй пытанні. Як паведамляе газета «Нью-Йорк таймс», пані Фокс, якая вырашае лёс тысяч неграў, як выбаршчыкаў, не змагла адказаць на гэтыя пытанні.

Але белым расістам з году ў год даводзіцца не лягчэй. У краіне расце і шырыцца рух неграў за дэмакратычныя правы, якіх яны фармальна дабіліся яшчэ сто год назад.

«Права галасаваць павінна быць прывілеяй, якую трэба заслужыць, і грамадства павінна накладаць пэўныя абмежаванні на выбарчае права, каб абараніць сябе ад чэрні»,—гаворыцца ў рэдакцыйным артыкуле часопіса «Уол-стрыт джорнэл».

Не часта трубадуры «дэмакратыі» ў «свабоднай Амерыцы» дазваляюць сабе выказвацца так адкрыта. Але калі яны сутыкаюцца з усё больш настойлівым патрабаваннем негрыцянскіх грамадзян Амерыкі, каб, нарэшце, у іх роднай краіне было прызнана іх права выбіраць і быць выбранымі, то тады яны адкідваюць сваю звычайную дэмагогію. У выніку і з'яўляюцца такія заявы.

З міжнароднага жыцця

НАРОД АНГЛІІ ЗА ЎСЕАГУЛЬНАЕ РАЗЗБРАЕННЕ

ЛОНДАН. Англійская асацыяцыя садзейнічання ААН правяла апытанне каля паўмільёна чалавек — прадстаўнікоў самых разнастайных слаёў насельніцтва і ўзростаў.

Амаль усе апытаныя—472.718 чалавек—выказаліся ў падтрымку ўсеагульнага і поўнага раззбраення, уключаючы ліквідацыю ўсіх відаў ядзернай зброі.

463.873 чалавекі выступілі за ўдзел Кітайскай Народнай Рэспублікі ў перагаворах па раззбраенню.

«НЯХАЙ ЖЫВЕ АЛЖЫР!»

ТУНІС. Вестка аб пагадненнях паміж урадам Францыі і Часовым урадам Алжырскай Рэспублікі маланкава разнеслася па Тунісу. Вуліцы туніскай сталіцы запоўніліся тысячамі алжырцаў, якія жывуць тут. Яны выйшлі на вуліцы цэлымі сем'ямі з нацыянальнымі алжырскімі флагамі. Людзі цалуюцца і плачуць ад радасці. Узнікаюць стыхійныя дэманстрацыі, удзельнікі якіх скандзіруюць словы «Ях'я аль-Джазаір!» («Няхай жыве Алжыр!»).

НОТА КУБЫ ЗША

ГАВАНА. Міністр замежных спраў Кубы Рауль Роа накіраваў дзяржаўнаму дэпартаменту ЗША ноту пратэсту супраць правакацый амерыканскай ваеншчыны ў раёне ваенна-марской базы ЗША Гуантанама.

Як адзначаецца ў ноце, у апошні час у раёне амерыканскай ваенна-марской базы Гуантанама пачасціліся правакацыі амерыканскай ваеншчыны, якія праяўляюцца ў адкрыцці агню супраць кубінскіх вартавых пастоў, у спробах пранікнуць на кубінскую тэрыторыю, у ажыццяўленні падпалаў і іншых актаў дыверсіі.

«МАРШ МІРУ»

КАРТОНА (правінцыя Арэца, Італія). Унушальны «марш міру» адбыўся ў нядзелю на граніцы трох правінцый і дзвюх абласцей Цэнтральнай Італіі. Больш чым 20 тысяч актыўных удзельнікаў руху супраць ваеннай небяспекі, за мір і ўсеагульнае раззбраенне сабралася ў невялікім населеным пункце Камучыя і накіравалася да старой ваеннай крэпасці, якая ўзвышаецца на вяршыні гары, за два кіламетры ад горада Картона.

Амаль 4 гадзіны працягвалася гэта шэсце, удзельнікі якога неслі лозунгі: «Свету—мір!», «За свет без войнаў!», «Не танкі,—а трактары!», «Не гарматы,—а дамы, кнігі, школы і бальніцы!», «Далоў каланіялізм!», «Няхай 1962 год будзе годам міру!», «За ўсеагульнае і поўнае раззбраенне».

«Мы вельмі любім жыццё і хочам, каб яно было добрым і шчаслівым,—сказаў нам мэр Картоны Італа Петручы.—Іменна таму мы вырашылі аб'яднаць усе нашы сілы для гэтай барацьбы за жыццё. Шмат хто з нашых працоўных не ўмее ні чытаць, ні пісаць. Але да кожнага з іх дайшоў вялікі сэнс выстаўленых М. С. Хрушчовым ад імя Савецкага ўрада прапаноў аб усеагульным раззбраенні, аб выключэнні самой магчымасці новых войнаў. І іменна таму з такой упэўненасцю нясуць наперад свае лозунгі ўдзельнікі «маршу міру».

НАВАЯЎЛЕНЫЯ КРЫЖАНОСЦЫ

БОН. Апошнія дні сцены славутых мюнхенскіх піўных сатрасаліся ад рову шматлікіх прыезджых наведвальнікаў. На працягу трох дзён у сталіцы Баварыі праходзіла так званая «міжнародная сустрэча былых франтавікоў». Туды прыбыло больш як 80 тысяч удзельнікаў вайны з усіх раёнаў Заходняй Германіі, а таксама дэлегацыі з 15 краін — галоўным чынам членаў НАТО.

«Сустрэча былых франтавікоў» з'явілася буйным мілітарысцкім зборышчам, накіраваным на распальванне антыкамуністычнай істэрыі і псіхалагічную падрыхтоўку да вайны. За ім стаялі Бон і найбольш ваяўнічыя колы НАТО.

У сталіцу Баварыі прыбыў прэзідэнт ФРГ Любке. Канцлер Адэнауэр і старшыня бундэсвера Герстэнмайер прыслалі ўдзельнікам сустрэчы прывітальныя тэлеграмы. Ганаровым госцем на зборышчы быў камандуючы бундэсвера ваенны злачынца генерал Ферч.

ЛАБОЎКІНА Паліна Міхайлаўна шукае сваіх дзяцей: сына **ШЫКАНАВА Пятра Паўлавіча,** 1937 года нараджэння, і дачку **ШЫКАНАВУ Ефрасінню** (можа называцца і **Людай**), 1939 года нараджэння, ураджэнцаў вёскі Белякова Суражскага раёна Віцебскай вобласці.

У дзяўчынкі выкалаты на руцэ нумар 66062.

У хлопчыка на адной назе два пальцы зросшыся разам, блакітныя вочы, валасы светлыя.

Дзеці разлучыліся з маці ў канцлагеры ў горадзе Асвенцім (Аўшвіц) у 1943 годзе.

* * *

КУЗЬМЯНКОВА Мікалая Харытонавіча, 1919 года нараджэння, і **ПРАКОПЦАВА Сяргея Осіпавіча,** 1915 года нараджэння, якія ў перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі знаходзіліся на часова акупіраванай тэрыторыі ў Латвійскай ССР, шукае іх сваяк **Кузьмянкоў Павел Харытонавіч,** які жыве ў г. Калінкавічы па Кастрычніцкай вуліцы, дом № 6.

НАШ АДРАС

Мінск, Ленінскі праспект, 77. Дом друку. Для пісьмаў: Мінск, паштовая скрынка № 14.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.